АКТУАЛЬНА

# «БУДАЎНІЧАЯ АМНІСТЫЯ» Ў ДЗЕЯННІ

## Спрошчаным парадкам могуць скарыстацца каля 35 тысяч уладальнікаў такіх будынкаў



Як вядома, 13 студзеня Прэзідэнтам Беларусі быў падпісаны Указ № 10 аб падаўжэнні «будаўнічай амністыі» на тры гады. Гэты дакумент быў падрыхтаваны згодна з даручэннем кіраўніка дзяржавы, у тым ліку дзякуючы шматлікім зваротам грамадзян у Адміністрацыю Прэзідэнта, ва ўрад і ў Мінбудархітэктуры. Гэта былі простыя жыхары нашай краіны, якія не паспелі ўзаконіць сваё самавольныя пабудовы. Цяпер у іх з'явілася магчымасць забяспечыць рэгістрацыю такіх аб'ектаў без адміністрацыйнай цяганіны і штрафаў.

Пра гэта паведаміла **начальнік Галоўнага ўпраўлення будаўніцтва і жыллёвай палітыкі Міністэрства архітэктуры і будаўніцтва Тацццяна ВАСІЛЮЧАК.** У перыяд дзеяння папярэдняга ўказа ў краіне гэтым механізмам было зарэгістравана каля 2 мільёнаў квадратных метраў індывідуальных будынкаў, што з'яўляецца практычнай паловай ад уводу жылых дамоў у цэлым па краіне. Падаўжэнне «будаўнічай амністыі» дазволіць увесці ў эксплуатацыю да 1 студзеня 2028 года яшчэ каля 2,5 мільёна «квадратаў» жылля, або 35 тысяч індывідуальных жылых дамоў.

Прыёмка ў эксплуатацыю аб'ектаў будаўніцтва будзе весціся ў рамках адміністрацыйнай працэдуры на падставе заявы і ведамасці тэхнічных характарыстык. Тэрмін выканання працэдуры застаецца нязменным — 1 месяц. Заява падаецца ў службу «Адно акно» мясцовых выканкамаў.

Прыёмка аб'ектаў будзе весціся прыёмачнай камісіяй, якая мае права і адмовіць грамадзяніну, калі аб'ект будаўніцтва не будзе гатовы да эксплуатацыі з улікам звестак, указаных у ведамасці тэхнічных характарыстык. Такое можа здарыцца, калі ў будынку, напрыклад, адсутнічаюць дах, вокны, уваходныя дзверы, ацяпленне і іншае.

Абмежаванняў на падачу паўторнай заявы аб выдачы акта прыёмкі ў эксплуатацыю не ўстаноўлена. Пасля ліквідацыі заўваг грамадзянін мае права звярнуцца ў мясцовы выканаўчы камітэт з заявай паўторна.

Указ дазволіць комплексна вырашыць пытанні па навядзенні парадку ў дачыненні да індывідуальных жылых дамоў, завершаных узвядзеннем або рэканструкцыяй, лічыць прадстаўнік Мінбудархітэктуры. Сутнасць у тым, што аднакватэрныя жылыя дамы і нежылыя пабудовы, узведзеныя або рэканструяваныя без праекта або з адступленнем ад праекта, цяпер могуць быць прыняты ў эксплуатацыю ў спрошчаным парадку. Пры гэтым такія пабудовы не будуць прызнавацца самавольнымі, а значыць, уладальнікі не нясуць адміністрацыйную адказнасць і на іх не накладаецца штраф за незаконнае будаўніцтва.

Гэта значыць, самы час узаконіць пабудаваныя калісьці лазню, гараж або навес, прыбудаваную да дома веранду або ганак. Зносіць або плаціць штраф не прыйдзецца.

**Сяргей КУРКАЧ.**

ПАРАДАК НА ЗЯМЛІ

# У ГАСПАДАРЧЫ АБАРОТ УЦЯГНУЦЬ 5,5 ТЫСЯЧЫ ПУСТЫХ ДАМОЎ

## Планавыя паказчыкі павялічаны на чвэрць

Як паведамілі ў Дзяржаўным камітэце па маёмасці, такім чынам будзе добраўпарадкавана каля 1180 гектараў плошчаў пад гэтымі будынкамі.

Выканаўчым камітэтам ужо даведзены планавыя паказчыкі ў разрэзе раёнаў і абласцей па ўключэнні ў гаспадарчы абарот пустых жылых дамоў і занятых імі зямельных участкаў. Як адзначылі ў Дзяржаўным камітэце па маёмасці, з улікам правядзення Года добраўпарадкавання ў параўнанні з мінулым годам планавыя паказчыкі павялічаны на чвэрць.

Летась продаж такой нерухомасці павялічыўся на 40 працэнтаў — новых уласнікаў знайшлі 1369 дамоў. Пры гэтым каля 60 % будынкаў было рэалізавана за адну базавую велічыню (з 1 студзеня — 42 рублі).

Як нагадалі ў Дзяржкаммаёмасці, у адпаведнасці з Указам Прэзідэнта ад 24 сакавіка 2021 года № 116 пустыя жылыя дамы могуць быць уцягнуты ў гаспадарчы абарот шляхам іх продажу, зносу або прадастаўлення новаму карыстальніку зямельнага ўчастка з умовай зносу размешчанага на ім будынка.

## Панядзелак, 20 студзеня

### Беларусь 1

**6.00, 7.15, 8.20** Добрай раніцы, Беларусь!
**7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 15.00** Навіны.
**8.15, 18.45** Зона Х (16+).
**9.15** Галоўны эфір.
**10.50, 12.25 Меладрама «Узрост кахання» (16+).**
**13.10, 15.15 Меладрама «Стэнаграма лёсу» (16+).**
**17.45** Беларуская часіна.
**19.00** Перадвыбарныя дэбаты кандыдатаў у Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь.
**20.00** Адзін дзень (12+).
**20.25** «Нашы ў КХЛ». Тэлефільм (12+).
**20.55** «Фактар. BY».
**21.00** Панарама.
**21.50** Час выбраў нас (12+).
**22.45** Зразумелая палітыка.
**23.00 Серыял «След» (16+).**

### АНТ

**6.00, 7.10, 8.10** «Наша раніца».
**7.00, 8.00, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00, 20.30** Нашы навіны.
**9.10** Контуры.
**10.15** «Жыць здарова!» (16+)
**11.15** «Модны прыгавор» (6+).
**12.10** «Белыя Росы» (12+).
**12.40, 13.15, 0.25 Фільм «Пісьмы на шкле. Лёс» (12+).**
**15.00** «Давай пажэнімся!» (16+)
**16.20** «Мужчынскае/Жаночае» (16+).
**17.20, 18.20** Інфармацыйны канал (16+).
**19.00** «Яшчэ не вечар» (16+).
**20.10** Вячэрнія навіны.
**21.20** «Мы — беларусы» (16+).
**22.15** Фільм «Хвіліна цішыні» (16+).
**2.10** «Спартклуб» (16+).

### СТБ

**6.00, 6.40, 7.45, 8.40** «Раніца СТБ».
**6.30, 7.30, 08.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** Навіны «24 гадзіны».
**9.00** «Тыдзень».
**10.20** «Слова і справа».
**10.40** Дак. праект «Неверагодная навука» (12+).
**13.50, 0.50 «Вышук». Серыял (16+).**
**16.50** «Міншчына».
**17.00 «Пад абаронай». Серыял (16+).**
**18.30** «Па сутнасці».
**20.15** «Пытанні ад бландзінак».
**20.25, 23.05** «СТБ-спорт».
**20.35** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.45 «Цвярская». Серыял (16+).**
**23.20** «Азаронак. Напраму».

### МІР

**5.00** Мультфільмы (6+).
**6.00, 10.00, 13.00, 16.00, 18.30** Навіны.
**6.15, 0.30** «Наша кіно. Гісторыя вялікай любові» (16+).
**6.50 Маст. фільм «Таямніца «Чорных драздоў» (16+).**
**8.45, 10.20 Тэлесерыял «Траса» (16+).**
**10.10** «Беларускі стандарт» (12+).
**13.15** «Міравое пагадненне» (16+).
**14.10** «Справы судовыя. Бітва за будучыню» (16+).
**15.05** «Справы судовыя. Новыя гісторыі» (16+).
**16.15** «Справы судовыя. Яблык разладу» (16+).
**17.15** «Справы судовыя. Грошы вярніце!» (16+)
**18.45** Дак. фільм «Час магчымасцяў» (12+).
**19.10** «Гульня ў кіно» (16+).
**21.15** «Гульня ў кіно. Чэмпіянат свету» (16+).
**22.00** «Мільён за 5 хвілін» (16+).
**22.45 Маст. фільм «Жаніцьба Бальзамінава» (16+).**
**1.00** «КультАсобы» (12+).
**1.20** «Першы Еўразійскі канал» (12+).
**2.20 Маст. фільм «Любімая дзяўчына» (16+).**
**3.45 Тэлесерыял «Школа выжывання ад адзінокай жанчыны з трыма дзецьмі ва ўмовах крызісу» (12+).**

### Першы Інфармацыйны

**5.00, 6.05** Галоўны эфір (12+).
**5.20, 6.25** Навіны эканомікі (12+).
**5.30, 6.35, 7.40, 14.50, 18.50, 0.15, 1.10, 2.10, 3.10, 4.10** Дзень спорту.
**5.35, 6.40, 7.50, 8.45, 13.35** Прэс-агляд (12+).
**5.40, 6.45** Меркаванне клуба (12+).
**5.55, 7.45, 9.50** Тэхнагайд (12+).
**6.00, 0.00** Гімн.
**6.55** Громаў LIVE (12+).
**7.00, 8.00, 9.00, 10.00, 11.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 19.50** Навіны.
**8.40, 8.50, 9.45, 10.50, 11.30, 11.55, 12.25, 13.40, 15.25, 20.00, 20.30, 21.00, 22.00, 23.00, 0.05, 1.00, 2.00, 3.00, 4.00** Навіны. Дайджэст.
**9.40, 18.40, 22.50** Баявое дзяжурства (12+).
**10.10** Вакол планеты (12+).
**11.10, 11.35, 21.15** Тэлефільм (16+).
**12.30, 1.30, 14.20, 16.05, 2.30** Дак. фільм (12+).
**13.45** Твой горад (12+).
**14.10, 17.20** Навіны. Мінск.
**15.15, 18.10, 20.35, 22.15** Актуальнае інтэрв'ю (12+).
**15.30, 18.30** Навіны рэгіёна.
**17.45, 03.30** Спецыяльны рэпартаж (12+).
**19.35, 22.35, 0.20, 1.15, 2.15, 3.15, 4.15** Сфера інтарэсаў (12+).
**20.05, 23.15, 0.35** Зразумелая палітыка (12+).
**20.20, 21.55, 0.50, 3.45** Аўтарскі погляд (12+).
**23.30, 4.30** Арэна (12+).

### РТР—Беларусь

**6.00, 9.00, 10.00, 11.30, 14.30, 17.30, 21.00, 23.00** Беларусь. Навіны.
**6.05** «Новая раніца».
**9.05, 10.05 Серыял «Кулагіны» (16+).**
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.40** «Акцэнты».
**12.40** «Пра самае галоўнае» (12+).
**13.45** «Плюс-мінус».
**14.40 Тэлесерыял «Адбітак зоркі» (12+).**
**15.30** «60 хвілін».
**17.40** «17 імгненняў краіны».
**18.10** Гумарыстычная праграма (16+).
**18.45** «Малахаў» (16+).
**21.30, 23.15 Серыял «Скліфасоўскі» (12+).**
**23.50** «Вечар з Уладзімірам Салаўёвым» (12+).

### НТБ—Беларусь

**6.15** «Астрапрагноз».
**6.20** Беларусы (6+).
**6.55** «Навука побач» (6+).
**7.30** «Маршрут пабудаваны» (12+).
**8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**8.25 Меладрама «Бальная сукенка» (6+).**
**10.35 Камедыя «Культпаход у тэатр» (12+).**
**12.20** «Інфашчыт» (16+).
**13.20, 22.30, 23.35** Сёння. Галоўнае.
**13.25** «Надзвычайнае здарэнне».
**13.55** «За гранню» (16+).
**14.55** «ДНК» (16+).
**16.35, 20.00** Галоўнае. Сёння. Беларусь.
**16.50 Серыял «Пёс» (16+).**
**20.15, 21.35 Дэтэктыў «Першы аддзел» (16+).**
**21.15** «НЗ.by».
**22.35, 23.50 Серыял «Шэф. Вяртанне» (16+).**

### Беларусь 3

**7.00** «Дабраранак».
**7.35** «Беларуская кухня».
**8.05, 13.00, 16.05, 20.30, 22.55** «Навіны культуры».
**8.15, 21.05 «Шыфр-2». Маст. фільм (16+).**
**10.10** «Культурны тыдзень».
**10.50, 17.10 «Прыгоды Шэрлака Холмса і доктара Ватсана». Маст. фільм. «Скарбы Агры» (12+).**
**12.05** «Нацыянальны хіт-парад».
**13.10** «Апошні дзень» (12+).
**13.45 «Вуліца поўная нечаканасцей». Маст. фільм (12+).**
**15.00** «Наперад у мінулае».
**15.40** «Навука побач» (6+).
**16.15** «Славянскі базар у Віцебску».
**18.25** «Легенды кіно» (12+).
**19.05 «Апякун». Маст. фільм (12+).**
**20.40** «Калыханка» (0+).
**23.10** «Суразмоўцы».
**23.25** «Люблю і памятаю». Аўтарская праграма.

### Беларусь 5

**7.00** Хакей. КХЛ. «Амур» (Хабараўск) — «Металург» (Магнітагорск).
**8.55** Вялікі тыдня.
**9.40** Баскетбол. Адзіная ліга. ЦСКА (Масква) — «Лакаматыў-Кубань».
**11.35** Вялікі спорт.
**12.20** Хакей. КХЛ. «Адмірал» (Уладзівасток) — «Ак Барс» (Казань).
**14.50** Міні-футбол. Чэмпіянат Беларусі. «Сталіца» (Мінск) — ВРЗ (Гомель).
**16.40** Вольная барацьба. Чэмпіянат Беларусі. Мужчыны.
**18.35** VeloLove.
**18.55** Хакей. МХЛ. «Дынама-Шыннік» — МХК «Дынама» (Масква). У перапынках — «Спорт-цэнтр».
**21.25** Агляд НХЛ.
**22.10** Спорт-цэнтр.
**22.20** Змешаныя адзінаборствы.

### Беларусь 2

**6.00** «Уключайся!» (12+)
**10.00, 13.30, 16.55** Тэлебарометр.
**10.05 Дэтэктыў «Абанемент на расследаванне. Небяспечныя жаданні» (16+).**
**14.00** «Дзіця з пекла» (16+).
**15.10** «Кентэрвільскі прывід» (6+).
**16.35** Мультсерыял «Кацяня Шмяк» (0+).
**17.00 Камедыйная «Улётны экіпаж» (16+).**
**18.45** Суд вырашыць (16+).
**19.45** «Сляпая». (16+).
**20.15 Серыял «Цудоўная пяцёрка» (16+).**
**21.10** Спортлато 6 з 49, КЕНА.
**21.15 Дэтэктыў «Дама з сабачкам» (16+).**
**23.10 Дэтэктыў «Мажор» (16+).**
**0.10** «Сям'я. Перазагрузка». Дакуд. драма (16+).